Беларусь.info

№84 29/06/2006

*Найдакладнейшае вымярэнне каштоўнасці чалавека — не тое, што ён робіць у час спакою і ўтульнасці, а тое, як ён трымаецца падчас барацьбы і супярэчнасцяў.*

**Марцін Лютэр Кінг**

Грамадская пазапалітычная і пазацэнзурная ініцыятыва. Распаўсюджваецца бясплатна

# Падзеі

**Не выключана, што сёння ў Маскве будзе абмяркоўвацца і беларускае пытанне - з такой ініцыятывай выступіла дзяржсакратар ЗША Кандаліза Райс.** У Маскве праходзіць сустрэча міністраў замежных спраў краін "Вялікай васьмёркі". Кіраўнікі знешнепалітычных ведамстваў Германіі, Вялікабрытаніі, Італіі, Канады, Расіі, ЗША, Францыі, Японіі і Аўстрыі, якая старшынствуе ў Еўрасаюзе, разгледзяць пытанні, што будуць вынесеныя на сустрэчу кіраўнікоў дзяржаў краінаў "Вялікай васьмёркі" ў Санкт-Пецярбургу.

**Удзельнікі ліквідаванага рашэннем суду Брэсцкага абласнога моладзевага грамадскага аб'яднання "Сузор'е" рыхтуюць зварот у Раду ААН па правах чалавека.** Як паведаміў праваабаронца Раман Кісляк, маладыя людзі лічаць, што парушаная свабода асацыяцыі, якая не можа быць абмежаваная ў адпаведнасці з міжнародным Пактам аб грамадзянскіх і палітычных правах. Фармальнай падставай для ліквідацыі "Сузор'я" стала папярэджанне за няўчаснае наданне дакументаў ва ўпраўленне юстыцыі аблвыканкаму.

**Дэпутат Хрол прапануе ўвесьці “падатак на багатых”.** Кожны ўласьнік аўтамабіля з аб’ёмам рухавіка больш чым за 2 літры мусіць плаціць адмысловы падатак, эквівалентны 100 даляраў штогоду. З такой прапановай сёньня выступіў дэпутат Палаты прадстаўнікоў Васіль Хрол. Першы намесьнік міністра транспарту й камунікацыі Мікалай Верхавец выказаўся супраць такога падатку. На ягоную думку, існуе іншы варыянт — ад 2007 году павялічыць акцыз на паліва й дадатковыя грошы аддаць на рамонт дарог.

**Мікалая Аўтуховіча могуць асудзіць на тэрмін ад 3 да 10 гадоў**. Закончылася судовае сьледзтва па крымінальнай справе супраць прадпрымальніка Мікалая Аўтуховіча й ягонага калегі Юрыя Лявонава. Днямі ім выставілі новае абвінавачаньне, паводле якога пакараньне мае быць больш жорсткім — ад трох да дзесяці гадоў зьняволеньня, раней Аўтуховіч мог разьлічваць нават на “хімію”.

# Цытаты

**Аляксандр Мілінкевіч: “Я лічыў і лічу, што Беларусь ніхто не ізаляваў.** Яна ізалявала сама сябе. Беларускі парлямэнт не абраны, а прызначаны. І гэта ведае ўвесь цывілізаваны сьвет. І сапраўды — заўсёды варта пакідаць дзьверы прыадчыненымі. Але калі дзьверы прыадчыненыя, дык першы крок павінен зрабіць той, хто парушае законы, хто сам сябе ізаляваў”.

# Абвесткі

**Новы конкурс – "Фота Свабоды"**. "Фота Свабоды" – Ваш погляд на беларускае жыццё. Дасылайце (з кароткім апісаннем – што, дзе, калі) здымкі падзеяў, сітуацыяў, людзей на адрас svaboda@rferl.org з пазнакай "fota Svabody". Падрабязнасці на www.svaboda.org